***К.А. Кутавая***
БГУ (Мінск)

# УПЛЫЎ МЯЦЕЖА М. ГЛІНСКАГА 1508 ГОДА НА ЎНУТРЫ І ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА ВКЛ

Князь Міхаіл Львовіч Глінскі адыграў немалаважную ролю ў гісторыі ВКЛ у першым дзесяцігоддзі XVI ст. Даследчыкі не раз звярталі ўвагу на неадназначнасць гэтай асобы і яе ролю ў мяцежы 1508 г., які аказаў значны ўплыў на ўнутры- і знешнепалітычнае становішча краіны. Ёсць некалькі меркаванняў наконт прычыны арганізацыі мяцежа. Напрыклад, М.М. Кром і А.Е. Праснякоў звязваюць падзеі 1508 г. з авантурызмам Міхаіла Глінскага і яго жаданнем улады. М.А. Шніп называе прычынамі выступлення супрацьстаянне Міхаіла Глінскага з Янам Забярэзінскім, заснаванае на разыходжанні па эканамічных і палітычных пытаннях, а таксама нежаданне вялікага князя Жыгімонта І вырашыць справу Міхаіла Глінскага ў судзе і пазбаўленне князёў Глінскіх занятых імі пасад.

Трэба адзначыць, што род Глінскіх не належыў да найбольш заможных. Гэта растлумачвае імкненне Міхаіла Глінскага да хуткага кар’ернага росту і падтрымкі манарха. Пры двары вялікага князя Аляксандра Міхаіл меў вельмі высокае становішча. Пасля ўзыхода на прастол Жыгімонта І з-за інтрыг другіх магнатаў, і ў асаблівасці Яна Забярэзінскага, ён страчвае сваю высокую пасаду. Вытокам канфлікта Міхаіла Глінскага і Яна Забярэзінскага была барацьба паміж імі за ўплыў на манарха і высокія пасады. Паглыбленню крызісу адносін спрыяла нейтральная пазіцыя вялікага князя літоўскага Жыгімонта ў спрэчках паміж магнатамі. Магчыма, калі б гасудар своечасова звярнуў увагу на ўсю сур’ёзнасць канфлікту паміж Глінскім і Забярэзінскім, усіх наступстваў іх барацьбы можна было б пазбегнуць. Але вынікам усяго гэтага стаў мяцеж Міхаіла Глінскага 1508 г.

Выступленне Міхаіла Глінскага, якое мела стыхійны пачатак, на працягу 1508 г.ператварылася з прыватнага наезда на ўдзел Забярэзінскага ў антыдзяржаўны мяцеж. Ён меў некалькі этапаў: на першым этапе (люты –

сакавік 1508) Міхаіл Глінскі імкнуўся дабіцца прабачэння вялікага князя літоўскага Жыгімонта дыпламатычным шляхам. Аднак, не атрымаўшы станоўчага адказу, ён прыняў рашэнне перайсці ў маскоўскае падданства. Вайсковая кампанія мяцежнікаў падчас другога этапу выступлення (другая палова сакавіка – пачатак жніўня 1508) пры ўдзеле маскоўскага падмацавання была беспаспяховай. Слуцк, Бабруйск, Менск, Барысаў, Орша, Крычаў і Мсціслаў – гарады, на якія была скіравана іх агрэсія, захоплены не былі. Але адзіным горадам, які з часу пераходу Глінскіх у маскоўскае падданства да моманту іх выезду ў Маскву заставаўся пад іх кантролем, з’яўляўся Мазыр. І менавіта Мазыр мэтазгодна называць цэнтрам мяцяжу. Трэці этап мяцежа (канец жніўня – лістапад 1508) характырызуецца імкненнем мяцежнікаў захаваць за сабой Тураў і Мазыр.

Мяцеж 1508 г. аказаў уплыў на грамадска-палітычнае развіццё ВКЛ. Дзякуючы яму ва ўнутранай палітыцы дзяржавы пачалісь змены. Да ўдзелу ў дзяржаўным кіраўніцтве стала больш актыўна прыцягвацца з этнічных беларускіх і ўкраінскіх зямель, так званая “руская”, праваслаўная знаць. Разам з тым, паражэнне Міхаіла Глінскага, яго ўцёкі ў Маскву і раздача зямель мяцежнікаў у пэўнай ступені выклікалі ў ВКЛ новы віток магнацкіх канфліктаў на эканамічнай глебе.

Выкарыстанне мяцяжу Міхаіла Глінскага маскоўскай дыпламатыяй для пачатку новай вайсковай кампаніі ў межах вайны 1507 – 1508 гг., перамовы мяцежнікаў з крымскім ханам і малдаўскім ваяводам, кантакты з заволжскімі татарамі вясной 1508 г. і ўсталяванне сувязяў Масквы з Максімілянам І Габсбургам пры пасрэдніцтве Глінскага восенню таго ж года дазваляе сцвярджаць, што мяцеж у ВКЛ меў значны рэзананс на еўрапейскіх абшарах і стаў чарговым этапам міждзяржаўнага супрацьстаяння ва Усходняй Еўропе.